УА “БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ А.С. ПУШКІНА”
ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

СТУДЭНЦКАЕ НАВУКОВАЕ ТАВАРЫСТВА

ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ

САВЕТ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ

АКАДЭМІЯ МАЛАДЫХ ГІСТОРЫКАЎ

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ МАЛАДЫХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ

# КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА І ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ





7–8 /12
2023

БРЭСТ, 2023

**Шаноўныя калегі, студэнты, магістранты, аспіранты і маладыя вучоныя!**

Запрашаем Вас прыняць удзел у **Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі маладых даследчыкаў "Культурная спадчына і гістарычная памяць"**, што пройдзе на базе гістарычнага факультэта УА "БрДУ імя А.С. Пушкіна" **7–8 снежня 2023 г.**

***Формы ўдзелу:*** вочная, дыстанцыйная (on-line), завочная (з прадстаўленнем тэксту даклада).

***Праблемнае поле канферэнцыі:***

- даследаванні сусветнай і айчыннай археалагічнай спадчыны;
- матэрыяльная і нематэрыяльная гісторыка-культурная спадчына: вывучэнне, захаванне;
- гістарычная памяць: формы ўвасаблення, падыходы да даследавання;
- вусная гісторыя ў вывучэнні і захаванні гістарычнай памяці;
- этналогія і сацыякультурная антрапалогія: даследаванні грамадства як суб'екта захавання гісторыі, традыцый, памяці;
- культурная спадчына і гістарычная памяць у кантэксце педагагічнай дзейнасці;
- турыстычны патэнцыял гісторыка-культурнай спадчыны: стратэгіі папулярызацыі і выкарыстання.

У рамках працы канферэнцыі для ўдзельнікаў і слухачоў будуць арганізаваныя **воркшопы** па розных напрамках практычнай даследчай дзейнасці:

WORKSHOP

**Вопыт выкарыстання паветранага лазернага сканавання на археалагічных помніках Беларусі ў 2022–2023 гг.**

Паліна Сяргееўна Курловіч, археолаг
кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ

Аляксей Аляксандравіч Сазонаў, географ
старшы выкладчык старшы выкладчык кафедры глебазнаўства і геаінфармацыйных сістэм факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ

**Практыка візуальна-антрапалагічнага даследавання дзявоцкай штодзённасці**

Аксана Аляксандраўна Селях, этнолаг
магістр гістарычных навук, кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ

**Тэхналогія тысячагоддзяў: некаторыя аспекты крэмнеапрацоўкі**

Алег Юр'евіч Ткачоў, археолаг
магістр гістарычных навук, навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі

Аляксандр Мікалаевіч Вашанаў, археолаг
магістр гістарычных навук, навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі

**Археалагічная скура: віды, вырабы, праблемы захавання і вывучэння**

Вадзім Ігаравіч Граф, археолаг
магістр гістарычных навук, малодшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі

Таксама плануецца выезд ўдзельнікаў канферэнцыі на адзін з гістарычных (археалагічных) помнікаў Берасцейскага рэгіёна.

Для ўдзелу ў канферэнцыі неабходна зрабіць электронную заяўку /рэгістрацыю/ да 00:00 30.11.2023.

!!!ЗАРЭГІСТРАВАЦЦА!!!

Персанальныя запрашэнні будуць дасланыя не пазней 02.12.2023.

Арганізацыйны ўнёсак (кава-брэйкі, бэйджы, выезд і г.д.) складае **7 рублёў** для вочных удзельнікаў канферэнцыі.

Жадаючыя апублікаваць даклад ў выглядзе артыкула павінны да 31.12.2023 даслаць вычытаны і афармлены ў адпаведнасці з патрабаваннямі тэкст на электронны адрас: archebrest@gmail.com.

Тэксты артыкулаў студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў павінны суправаджацца водгукам навуковага кіраўніка. Артыкулы будуць правярацца на плагіят, і адхіляцца ад публікацыі пры вялікай колькасці запазычанага матэрыялу. Тэксты дакладаў, што не адпавядаюць праблемнаму полю канферэнцыі, крытэрыям навуковасці і правілам афармлення, або якія патрабуюць значнай рэдактарскай дапрацоўкі, разглядацца не будуць. Арганізацыйны камітэт мае права не тлумачыць прычыны магчымага адхілення заявак.

Артыкулы, што атрымаюць станоўчыя водгукі рэцэнзентаў, будуць апублікаваныя ў 2024 годзе ў чарговым (16) выпуску зборніка навуковых артыкулаў “Моладзь Берасцейшчыны”. Кошт публікацыі будзе вызначаны і паведамлены ўдзельнікам пасля канчатковай падрыхтоўкі зборніка да выдання ў лютым 2024 года.

***Патрабаванні да афармлення тэкстаў артыкулаў:***

- Аб’ём – до 20 тыс. знакаў;
- Старонкі – фармату А4 (210 х 297 мм); усе палі – 2,5 см; водступ – 1 см.
- Рэдактар - Microsoft Word.
- Шрыфт – Times New Roman, кегль – 12 pt, інтэрвал - 1.
- Назва файла - прозвішча аўтара і абрэвіятура ўстановы лацінскімі літарамі.
- Структурныя элементы артыкула:

1) УДК (*размяшчэнне па левым баку з водступу*);
2) Ініцыялы і прозвішча аўтара / аўтараў (*тлусты шрыфт*);
3) Горад і, праз коску, скарочаная назва ўстановы (*размяшчэнне па левым баку з водступу*);
4) Дадзеныя навуковага кіраўніка /калі ёсць/ (*курсіў, размяшчэнне па левым баку з водступу*);
4) Пусты радок
5) Назва артыкула (*вялікія літары, тлусты шрыфт, размяшчэнне па левым баку, з водступу*);
6) Пусты радок;
7) Анатацыя (*до 400 знакаў, кегль – 10 pt, курсіў, фарматаванне па шырыні, з водступу*);
8) Пусты радок;
9) Тэкст навуковага артыкула (*фарматаванне па шырыні і без пераносаў у адпаведнасці з патрабаваннямі, указанымі вышэй; спасылкі на крыніцы падаюцца ў тэксце лічбамі ў квадратных дужках* [1, с. 187]; *канцавыя зноскі не дапускаюцца*);
10) Пусты радок;
11) Звесткі аб крыніцах (*кегль – 10 pt, неабходна аформіць згодна патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь у алфавітным парадку; слова «літаратура» не пішацца*);
12) Пусты радок;
13) На англійскай мове (*кегль – 10 pt*):
    - ініцыял і прозвішча аўтара (аўтараў) (*размяшчэнне па левым баку, з водступу*);
    - назва артыкула (*тлусты шрыфт, размяшчэнне па левым баку, з водступу*);
    - тэкст анатацыі (summary) (*фарматаванне па шырыні, з водступу*).

## ПРЫКЛАД АФАРМЛЕННЯ АРТЫКУЛА

УДК
**І.І. Паніч**
Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна

**НАЗВА АРТЫКУЛА**

*Тэкст анатацыі* ..........................................................................................................................................
..........................................................................................................................................................................
.................................................................................................................

Тэкст артыкула ____________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
_____________________________________

1. Крыніца ______________
2. Крыніца ______________

I. Panich
**Article Title........**
Summary text ...............................................................................................................................................
..........................................................................................................................................................................
.................................................................................................................

Для забеспячэння аператыўнага абмена інфармацыяй і вырашэння арганізацыйных момантаў працуе тэлеграм-канал канферэнцыі, дзе можна сачыць за навінамі, а таксама задаць пытанні арганізатарам праз каментары да паведамленняў. Доступ па спасылцы: https://t.me/pamyac. За даведачнай інфармацыяй можна таксама звярнуцца праз e-mail: archebrest@gmail.com. Спадзяемся на плённую сумесную працу!

***З павагай, Арганізацыйны камітэт***